Літаратурна-дакументальная экспазіцыя «Залатая раніца беларускага Адраджэння», прысвечаная паэтам і празаікам 1920—1930-х гг., адкрылася ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. Загадчыца навукова-экспазіцыйнага аддзела музея Вольга Гулева падкрэсліла, што менавіта названыя гады лічацца аднымі з самых яркіх старонак у гісторыі беларускай літаратуры: «Выходзіла шмат кніг, гучалі імёны маладых пісьменнікаў, паэтаў і крытыкаў. Час быў спрыяльны для развіцця нацыянальнай культуры і навукі». Як перадае БелТА, праект рыхтаваўся на працягу года. У экспазіцыі можна ўбачыць вытрымкі з розных выданняў таго часу. Матэрыялы для экспазіцыі — з фондаў музея і Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Таксама выкарыстаны электронныя копіі часопісаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.